Установа адукацыі
«Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны»

**А. В. БРАДЗІХІНА**

# УВОДЗІНЫ Ў ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

Практычны дапаможнік

для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 05 01
«Беларуская філалогія (па напрамках)»

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Гомель
ГДУ імя Ф. Скарыны
2021

УДК 82.09(076)
ББК 83я73
Б87

Рецензенты:

доктар філалагічных навук А. М. Мельнікава;
кандыдат філалагічных навук М. У. Буракова

Рэкамендавана да выдання навукова-метадычным саветам
установы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Францыска Скарыны»

**Брадзіхіна, А. В.**

Б87 Уводзіны ў літаратуразнаўства : практычны дапаможнік / А. В. Брадзіхіна ; Гомельскі дзярж. ўн-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2021. – 48 с.

ISBN 978-985-577-741-1

У дапаможніку прадстаўлены матэрыялы практычнай накіраванасці, неабходныя для якаснага асваення курса «Уводзіны ў літаратуразнаўства» будучымі настаўнікамі-славеснікамі: канспекты практычных заняткаў, заданні, спісы літаратуры, табліцы і інш.

Дапаможнік адрасаваны студэнтам-філолагам.

**УДК 82.09(076)**
**ББК 83я73**

**ISBN 978-985-577-741-1**

© Брадзіхіна А. В., 2021
© Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны», 2021

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ЗМЕСТ

Уступ…………………………………………………………….................. 4

1 Пытанні і заданні да практычных заняткаў……................................... 5

2 Самастойная кантралюемая работа…………………………………… 34

3 Найбольш складаныя пытанні дысцыпліны “Уводзіны ў літаратуразнаўства” ……………………………………………………… 37
3.1 Антычнае (метрычнае) вершаскладанне і яго асаблівасці……… 37
3.2 Танічная сістэма вершаскладання і яе народна-песенныя вытокі 38
3.3 Стылістычныя, або рытарычныя, фігуры……………………........... 40

4 Прыкладныя пытанні да экзамену…………………………………….. 47

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# УСТУП

Дысцыпліна дзяржаўнага кампанента “Уводзіны ў літаратуразнаўства” вывучаецца студэнтамі I курса спецыяльнасці 1-21 05 01 “Беларуская філалогія (па напрамках)”; напрамак спецыяльнасці 1-21 05 01-01 “Беларуская філалогія (Літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)”, 1-21 05 01-02 “Беларуская філалогія (Камп’ютарнае забеспячэнне)” і з’яўляецца адной з базавых профільных дысцыплін, неабходных для якаснай падрыхтоўкі студэнтаў-філолагаў да будучай прафесійнай дзейнасці.

Студэнты валодаюць пэўнымі ведамі з гісторыі літаратуры (найперш беларускай і рускай) і тэорыі літаратуры, атрыманымі ў сярэдняй школе. Ва ўніверсітэце дзякуючы вучэбнай дысцыпліне “Уводзіны ў літаратуразнаўства” адбываецца сістэматызацыя гэтых пазнанняў, значнае іх паглыбленне і пашырэнне. Дапаможнік “Практычныя рэкамендацыі па вывучэнні дысцыпліны «Уводзіны ў літаратуразнаўства»: для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 05 01 “Беларуская філалогія (па напрамках)” мае на мэце раскрыць асноўныя паняцці літаратуразнаўства ў адпаведнасці з дасягненнямі сучаснай навукі пра мастацкую літаратуру, арыентуецца на дыскусійныя праблемы тэорыі і метадалогіі і тым самым садзейнічае больш глыбокаму і арганічнаму засваенню курса, дазваляе сфарміраваць разуменне студэнтамі арганізацыі мастацкага твора як структурнага аб’яднання элементаў зместу і формы, спрыяе асваенню практыкі цэласнага і выбарачнага аналізу літаратурна-мастацкага твора. Урэшце, удакладненыя тэарэтыка-літаратурныя веды прыдадуцца для педагагічнай, навуковай, рэдактарскай і літаратурна-крытычнай дзейнасці спецыяліста-філолага. Сказанае вышэй надае дапаможнікам, што ўтрымліваюць практычныя рэкамендацыі па вывучэнні курса, асаблівае значэнне ў сістэме адукацыі студэнтаў-філолагаў.

У дапаможніку прадстаўлены канспекты практычных заняткаў, тэматыка, заданні і спіс літаратуры да тэм, адведзеных на самастойную кантралюемую работу студэнтаў, прыкладны спіс пытанняў да экзамену. Асобны раздзел прысвечаны асвятленню найбольш складаных для засваення студэнтамі пытанняў па дысцыпліне. Усё гэта спрыяе дакладнай структурызацыі і сістэматызацыі асноўных ведаў па курсе.

Агульная колькасць гадзін – 114 (3 заліковыя адзінкі); аўдыторных гадзін – 52, у тым ліку лекцыйных – 30 гадзін (з іх кантралюемая самастойная работа – 6 гадзін), практычных – 22 гадзіны. Форма справаздачы – экзамен (1 семестр).

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

# 1 ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ 1 ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА ЯК НАВУКА: ПРАДМЕТ, ЗАДАЧЫ І СТРУКТУРА КУРСА

1 Літаратуразнаўства як сістэма ведаў пра літаратуру.

2 Самастойныя і дапаможныя дысцыпліны літаратуразнаўства і іх узаемасувязь.

3 Напрамкі літаратуразнаўства на сучасным этапе.

4 Гісторыя развіцця літаратуразнаўства як навукі.

## Літаратура


1 Уводзіны ў літаратуразнаўства : у 2 ч. Ч. 1 : Літаратуразнаўства як навука. Эстэтыка літаратуры. Паэтыка / пад рэд. праф. В. П. Рагойшы. – Мінск : БДУ, 2009. – С. 4–50. ***(электронны варыянт падручніка ёсць у сецїве)***.

2 Введение в литературоведение : учебник / Н. Л. Вершинина [и др.]; под общ ред. Л. М. Крупчанова. – Москва : Издательство Оникс, 2005. – 416 с.

3 Введение в литературоведение / под ред. Г. Н. Поспелова. – Москва : Изд-во МГУ, 1985. – 245 с.

4 Борев, Ю. Б. Эстетика. Теория литературы: Энциклопедический словарь терминов / Ю. Б. Борев. – Москва : ООО “Изд-во Астрель”, ООО “Изд-во АСТ”, 2003. – 575 с.

5 Волков, И. Ф. Теория литературы : учебное пособие / И. Ф. Волков. – М. : Просвещение; Владос, 1995. – 256 с.

6 Лазарук, М. А. Уводзіны ў літаратуразнаўства / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Вышэйшая школа, 1982. – 277 с.

7 Лазарук, М. А. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Нар. асвета, 1983. – 191 с.

8 Рагойша, В. П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах / В. П. Рагойша. – Мінск: Белэнцыклапедыя, 2001. – 384 с.

9 Рагойша, В. П. На шляху да Парнаса. Даведнік маладога літаратара / В. П. Рагойша. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 158 с.

10 Руднев, В. Энциклопедический словарь культуры XX века: ключевые понятия и термины / В. Руднев. – Москва : Аграф, 2001. – 608 с.

11 Суслова, Н. В. Новейший литературоведческий словарь-справочник для ученика и учителя / Н. В. Суслова. – Мозырь : ООО ИД “Белый Ветер”, 2003. – 152 с.

12 Терра-Лексикон: Иллюстрированный энциклопедический словарь. – Москва : ТЕРРА, 1998. – 672 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

13 Літаратуразнаўства як навука [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: http://padruchniki.by/18211001/literatura/literaturoznavstvo_nauka.htm

14 Западное литературоведение XX века: энциклопедия / гл. научн. ред. Е. А. Цурганова. – Москва: Intrada, 2004. – 560 с.

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ 2
## ЛІТАРАТУРНЫЯ РОДЫ І ЖАНРЫ; ЭПАС ЯК РОД ЛІТАРАТУРЫ

1 Асаблівасці падзелу мастацкіх твораў на роды і жанры: гісторыя пытання.

2 Агульная характарыстыка эпасу як самастойнага роду літаратуры.

3 Малыя празаічныя адзінкі і іх асаблівасці.

4 Сярэднія і буйныя формы эпасу: спецыфіка арганізацыі мастацкага матэрыялу і ўвасаблення задумы.

***Заданне для падрыхтоўкі дома: прачытаць творы:***

– **“Люстэрка” з нізкі Барыса Пятровіча “Непатрэбныя рэчы”** (кніга “Шчасце быць…” (http://kamunikat.org/usie_knihi.html?pubid=11213);

– **“Талент заікання” з кнігі “Натуральная афарбоўка” А. Бахарэвіча** (http://kamunikat.org/usie_knihi.html?pubid=32766) ;

– **“Мільярд удараў” Ю. Станкевіча з аднайменнай кнігі**. http://kamunikat.org/usie_knihi.html?pubid=11559

## Літаратура

1 Введение в литературоведение : учебное пособие / Л. В. Чернец [и др.]; под ред. Л. В. Чернец. – Москва : Высш. шк., 2004. – 680 с.

2 Введение в литературоведение : учебник / Н. Л. Вершинина [и др.]; под общ ред. Л. М. Крупчанова. – Москва : Изд. Оникс, 2005. – 416 с.

3 Уводзіны ў літаратуразнаўства : у 2 ч. Ч. 1 : Літаратуразнаўства як навука. Эстэтыка літаратуры. Паэтыка / пад рэд. праф. В. П. Рагойшы. — Мінск : БДУ, 2009. – 208 с.

4 Лазарук, М. А. Уводзіны ў літаратуразнаўства / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Вышэйшая школа, 1982. – 277 с.

5 Лазарук, М. А. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Нар. асвета, 1983. – 191 с.

6 Борев, Ю. Б. Эстетика. Теория литературы: Энциклопедический словарь терминов / Ю. Б. Борев. – Москва : ООО “Изд-во Астрель”, ООО “Изд-во АСТ”, 2003. – 575 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

7 Суслова, Н. В. Новейший литературоведческий словарь-справочник для ученика и учителя / Н. В. Суслова. – Мозырь : ООО ИД “Белый Ветер”, 2003. – 152 с.

8 Рагойша, В. П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах / В. П. Рагойша. – Мінск : Белэнцыклапедыя, 2001. – 384 с.

9 Рагойша, В. П. На шляху да Парнаса. Даведнік маладога літаратара / В. П. Рагойша. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 158 с.

10 Руднев, В. Энциклопедический словарь культуры XX века: ключевые понятия и термины / В. Руднев. – Москва: Аграф, 2001. – 608 с.

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ 3
## ЛІРЫКА: АСНОЎНЫЯ РОДАВЫЯ І ЖАНРАВА-ВІДАВЫЯ ПРЫКМЕТЫ

1 Лірыка як адзін з асноўных родаў літаратуры.
2 Класіфікацыя лірычных твораў.
3 Лірычныя жанры і віды і іх характарыстыка.
4 Спецыфіка ліра-эпасу як роду літаратуры.

***Заданне для падрыхтоўкі дома: выпісаць і ведаць азначэнні лірычных відаў і жанраў.***

## Літаратура

1 Введение в литературоведение : учебное пособие / Л. В. Чернец [и др.]; под ред. Л. В. Чернец. – Москва : Высш. шк., 2004. – 680 с.

2 Введение в литературоведение : учебник / Н. Л. Вершинина [и др.]; под общ. ред. Л. М. Крупчанова. – Москва : Издательство Оникс, 2005. – 416 с.

3 Уводзіны ў літаратуразнаўства: у 2 ч. Ч. 1: Літаратуразнаўства як навука. Эстэтыка літаратуры. Паэтыка / пад рэд. праф. В. П. Рагойшы – Мінск : БДУ, 2009. – 208 с.

4 Лазарук, М. А. Уводзіны ў літаратуразнаўства / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Вышэйшая школа, 1982. – 277 с.

5 Лазарук, М. А. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Нар. асвета, 1983. – 191 с.

6 Борев, Ю. Б. Эстетика. Теория литературы : Энциклопедический словарь терминов. – Москва : ООО “Изд-во Астрель”, ООО “Изд-во АСТ”, 2003. – 575 с.

7 Суслова, Н. В. Новейший литературоведческий словарь-справочник для ученика и учителя / Н. В. Суслова – Мозырь: ООО ИД “Белый Ветер”, 2003. – 152 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

8 Рагойша, В. П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах / В. П. Рагойша. – Мінск : Белэнцыклапедыя, 2001. – 384 с.

9 Рагойша, В. П. На шляху да Парнаса. Даведнік маладога літаратара / В. П. Рагойша. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 158 с.

10 Руднев, В. Энциклопедический словарь культуры XX века: ключевые понятия и термины / В. Руднев. – Москва : Аграф, 2001. – 608 с.

11 Поспелов, Г. Н. Лирика среди литературных родов [Электронный ресурс] / Г. Н. Поспелов. – Москва, 1976. – Режим доступа: http://www.twirpx.com/file/791982/

***Заданне 1 (франтальнае): вызначыць від верша.***

**Р. Крушына**
**Маўклівая мэта**
Мастацтва мне мерка маралі,
Маўклівая мэта мая:
Мне мары міраж малявалі –
Міжземнае мора, маяк...
Магла маладосьць мудрагеліць,
Мадэрнічаць, мову мяздрыць,
Макухай малочных мяцеліц
Малое мясці, матлашыць.
Мая менавіта мясціна –
Мядовы мятліцаў мурог.
Манерыцца міла маліна,
Марошкаю моршчыцца мох.
Мастацтва мне мерка маралі,
Маўклівая мэта мая.
Мне мары маркотна міргалі:
Мінулае – мірсць матыля.

**Т. Барысюк**
**Крэда**
Я
тут
для
пакут.
Маю
чары.
Мэта –
мары.
Вершам

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

хачу
ўвечніць
душу.

**М. Багдановіч**
Ёсць чары у забытым, старадаўным;
Прыемна нам сталеццяў пыл страхнуць
І жыць мінулым – гэткім мудрым, слаўным, –

Мы любім час далёкі ўспамянуць,
Мы сквапна цягнемся к старым паэтам,
Каб хоць душой у прошлым патануць.

Таму вярнуўся я к рандо, санетам,
І бліснуў ярка верш пануры мой:
Як месяц зіхаціць адбітым светам, –

Так вершы ззяюць даўняю красой!

**В. Жыбуль**
**Пра раку Нёман**
О, Нёман! Сага снам ён!
Нёмана мутны смак,
А сам –
У крамяны рышток рамонкавы ліся,
І нам дары, тытан,
І лад, і лёс, і арку марам,
Хаду цуда-хмарам
У краі сёл і далін.
А ты… ты рад:
Манія сілы, вакно маркот, шырыня мар!
Кум асакам,
Сын туманам ён, Нёман, –
Сага снам ён.
О!

**Алесь Ліпай**
**Багдановіч – Беларусь**
Ён быў, як месяц, адзінокі:
Самотна жыў, самотна ўмёр...
Упалі з грудзей Пана Бога,
Парваўшыся, пацеркі зор.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Заміж пэрсідзкага вузору –
Зялёны, быццам лёд, халодны небасхіл.
І месца, дзе няма простору
Дзеля прыроды буйных сіл.
Душой стаміўшыся
ў жыццёвых цяжкіх бурах,
Ад родных ніў, ад роднай хаты
Мужык ідзе, – на світцы латы,
Ў душы гарыць агонь нуды пануры...
Вось сымбаль твой, забыты краю родны! –
Падаюць вішняў цвяты,
і разносіць іх вецер халодны.
Ёсьць чары у забытым, старадаўным!
Каб загаіць на сэрцы раны,
Каб хоць душой у прошлым патануць,
"Вянок",
Наш родны, забыты ў цяньку васілёк.
Ў блакіце пракладае пуць
Святыня лёгкаю ступою
Вэнэра узыходзіць над зямлёю.
І вулкі Вільні ззяюць і грымяць.
Кроў к сэрцу. Мана ўсё або не?
Старадаўнай Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць!

***Заданне 2 (у групах): вызначыць від верша.***

**Л. Сом**
Пераблытаўшы каханне з вайной,
Не здзіўляйся спусташэнню душы,
Бо паўсюль замест падвойных вяршынь
Атрымаеш празаічны двубой.

Ваяры ж малююць фарбай адной,
Бо ўсё жыццё жывуць на мяжы;
Пераблытаўшы каханне з вайной,
Не здзіўляйся спусташэнню душы.

За любым замком, за кожнай сцяной
Сніць сталёвыя ствалы і нажы.
Užaваёўнік… Ты навекі чужы,
Існуеш цяпер маной і віной,
Пераблытаўшы каханне з вайной.

**Л. Сом**
Поўня! Поўняй сэрца поўна,
Я іду, і мне не варта
Абарочвацца і помніць –
Ззаду краты, ззаду варта.

Ноч варожыць, снег – як воўна,
Толькі лепей грэе кварта…
Ах, няўжо мне не ўсё роўна –
Мне, каго чакае ўпарта
Поўня!...

Хто да раю, хто ў Тартар,
Я ж імкнуся, безумоўна,
Да цябе адной, без жартаў,
Поўня!

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Р. Крушына**
Цёплы спеў віяланчэлі,
Струнаў ціхі перазвон…
Ласкі-пешчы загучэлі.

Вобраз твой – у акварэлі.
Перадаў мне патэфон
Цёплы спеў віяланчэлі.

Гукі ў стройнасці мякчэлі,
Віўся з альтам барытон, –
Ласкі-пешчы загучэлі.

Мае вочы заблішчэлі,
Як пачуў я дзіўны звон,
Цёплы спеў віяланчэлі.

А ў душы маёй ярчэлі
І валошка, і рамон.
Ласкі-пешчы загучэлі.

**Э. Акулін**
Не вернецца назад Учора.
Прыбой аціх. Ачахлі зоры…
І не глядзі мне ўслед з дакорам.
Была зіма – астыгла мора.
Не вернецца назад Учора.
Дзе ложак – яхта. Хвалі – шторы…
Не вернецца назад Учора.
Прыбой аціх. Ачахлі зоры…

**А. Салавей**
Вітай
прыход сяўбы чаканае,
з сяўнёю поўнай пераймай!

Зірні:
вясна, табой спатканая,
жаўроніць звонка ў вышыні.

Зямля,
напоўненая зернямі,
закаласіцца спакваля.

Узрэж
свой тор надзеяў цернямі;
пасееш, будзеш жыў —
сажнеш.

**А. Грачанікаў**
Каханне – найцяжэйшая з пакут.
Мая добраахвотная пакута.
Калі ж ты мне свой вынесеш прысуд?
Нібы падсудны, прагну я прысуду.
У міг апошні здарыцца мо цуд,
І тое, што здавалася атрутай,
Каханне ператворыць у нектар
На ўсё жыццё для вязня гэткіх чар.

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ 4–5
## АСНОЎНЫЯ СІСТЭМЫ ВЕРШАСКЛАДАННЯ

1 Версіфікацыя як сістэма гукавой арганізацыі паэтычнай мовы.

2 Антычнае (метрычнае) і сілабічнае вершаскладанне і іх асаблівасці.

3 Сілаба-танічны верш.

4 Танічная сістэма вершаскладання і яе народна-песенныя вытокі; верлібр.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

***Заданне для падрыхтоўкі дома да практычных 4*****:** знайсці прыклады (з беларускай літаратуры, але <u>не са слоўнікаў</u>) усіх відаў рыфм.

***Заданне для падрыхтоўкі дома да практычных 5*****:** знайсці прыклады (з беларускай літаратуры, але <u>не са слоўнікаў</u>) сілаба-танічных метраў – ямба, харэя, дактыля, анапеста і амфібрахія; вольнага верша, свабоднага верша, лагаэда; танічнага верша (і вызначыць яго від: акцэнтны, акцэнтна-складовы, дольнік, тактавік).

## Літаратура


1 Рагойша, В. П. Уводзіны ў літаратуразнаўства: Вершаванне / В. П. Рагойша. – Мінск : БДУ, 2003 (2004) **(*электронны варыянт падручніка ёсць у сеціве)*.**

2 Введение в литературоведение : учебное пособие / Л. В. Чернец [и др.]; под ред. Л. В. Чернец. – Москва : Высш. шк., 2004. – 680 с.

3 Введение в литературоведение : учебник / Н. Л. Вершинина [и др.]; под общ. ред. Л. М. Крупчанова. – Москва : Издательство Оникс, 2005. – 416 с.

4 Лазарук, М. А. Уводзіны ў літаратуразнаўства / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Вышэйшая школа, 1982. – 277 с.

5 Лазарук, М. А. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Нар. асвета, 1983. – 191 с.

6 Суслова, Н. В. Новейший литературоведческий словарь-справочник для ученика и учителя / Н. В. Суслова. – Мозырь : ООО ИД “Белый Ветер”, 2003. – 152 с.

7 Рагойша, В. П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах / В. П. Рагойша. – Мінск : Белэнцыклапедыя, 2001. – 384 с.

8 Рагойша, В. П. На шляху да Парнаса. Даведнік маладога літаратара / В. П. Рагойша. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 158 с.


***Заданне 1 (у групах). Прааналізуйце верш, карыстаючыся прапанаваным планам:***

*1 Вызначце колькасць радкоў і колькасць вершарадоў у тэксце.*

*2 Знайдзіце ўсе рыфмапары, абазначыўшы іх агульную колькасць, прывядзіце прыклад семантызаваных і несемантызаваных рыфм.*

*3 Вызначце віды рыфм:*

*а) па месцы размяшчэння націску (мужчынскія, жаночыя, дактылічныя, гіпердактылічныя);*

*б) паводле фанетычных асаблівасцей:*

*- дакладныя (і яе разнавіднасці: аманімічная, каламбурная);*

*- прыблізныя;*

*- недакладныя:*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- *асанансныя;*
- *кансанансныя;*
- *апорныя;*
- *усечаныя;*
- *рознанацiскныя;*
- *анаграмныя.*

*в) у залежнасцi ад часцiны мовы:*

*- дзеяслоўныя;*
*- назоўнiкавыя;*
*- прыметнiкавыя;*
*- прыслоўныя;*
*- разнародныя;*

*г) па структуры:*

*- простыя;*
*- складаныя.*

*4 Ацанiце якасць рыфмаў.*

*5 Вызначце вiд рыфмоўкi (сумежная, перакрыжаваная, апаясная, монарыфма).*

*6 Вызначце вiд страфы i напiшыце схему верша, да прыкладу:*
*АвАв АвАв*

**ГРУПА 1**

**А. Хадановiч**

Вы ўся – бiзнэс-лэдзi, а часам палiтык.
А я толькi лiрык, i збольшага ныцiк.

Да позняга вечара пiшаце скаргу:
правоў чалавека ня скiнеце з карку.

I я Вам пiшу палiтычную ноту:
разгневаны лiст пра сваю адзiноту.

Бяз Вашага смутку, што тоiць усмешку,
нi калiва сэнсу на вулiцах Менску.

Навошта кавярнi й нашто кiназалi
бяз словаў, што Вы мне хоць зрэдку казалi?

А горад святкуе чужыя тэракты.
Цi гэтае сьнiў ты, цi гэтага праг ты?

Ад колiшнiх мараў няшмат засталося:
жаўцее лiстота, сiвее валоссе.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Спакусьліва сьцелюцца прыцемкі ў парку.
А любая піша чарговую скаргу.

**ГРУПА 2**

**А. Хадановіч**

@ @ @

Пішу Вам зь yahoo на tut.by,
а ў сеціве страйкуе пошта,
не заўважаючы таго, што
Вам дасылаюць "баю-бай!"

Ня я даўмеўся ўпершыню
складаць увечар калыханкі
і слаць іх удалечыню
на адрас да сваёй сяброўкі.

Вам адначасна шлю лісты
й званю па хатнім – не выходзіць,
і зноўку перайсці на "ты"
мне з Вамі нешта перашкодзіць.

Хтось адарваўся ад зямлі,
камусьці замінае праца,
і з Афрадытай разабрацца
няма калі.

Ды зноўку не засну ўначы,
Вам калыханку пеючы:
лісты Вам шлю, лісты-Вам-шлю-лі-
сты-Вам-шлю-лі… люлі… люлі…

**ГРУПА 3**

**А. Хадановіч**

@ @ @

Адскрабеш пін-код на купленай карце,
назавеш пароль электроннай варце,

далучаючы да сусветнага сьмецьця
лішні доказ свайго існавання ў свеце.

Тэлефон заняты і хата з краю:
калі ласка, на выхад, істота з краю,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дзе каманды ротам даюцца ротам
і задротам больш ня цесна за дротам.

Па начным тарыфе сабе дазволь ты
ператнуць высокі й высакавольтны,

бо палёты ня толькі ў сне і па сьмерці,
бо пакінеш сьлед, якога ня сьцерці,

завісаючы ўсур'ёз і надоўга
над Потсдамэрпляц і гарой Міндоўга,

над Сафіяй і сопацкаю эстрадай,
над Высокім Замкам і Вісластрадай,

па-над Нёманам з Барысам і Глебам,
па-над хмарамі й высакавольтным небам.

**ГРУПА 4**

**А. Хадановіч**

(папрыка зорак)
згубіўшыся ў небе робіш памылку зрокавую
бо цяжка кожную ноч на яе дзівіцца
красуня мае хваробу на шчасце зоркавую
на подыюме нябёсаў адзетая ў мілавіцу

блукаючы ў тропіках ракаў нябёсны экватар
з бляшанкаю miller'а перасякаеш бамжом
і два сузор'і вялікі й малы экскаватар
на знак старога знаёмства матляюць табе каўшом

сатурн баскетбольным мячом спыняецца ў кошыку
і пляскаеш у далоні яму з паддашша
стаміліся вочы ды не спыняюцца ў пошуку
калі ж над зямлёю ўзыдзе й загляне і ў наша

ваконца як орган зроку
ды слёзы з органа
у папрыцы зорак замнога зямнога перцу
і ты вандруеш па сьвеце з дакладнай мапаю зорнага
неба і бачыш вэнэру няўзброеным сэрцам

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**ГРУПА 5**

**А. Хадановіч**

дзве лыжкі солі на шклянку цёплага мора
якое цячэ з валасоў і на твары ня стыне
ляціш празь мяжу на сустрэчу са светлым tomorrow
і ўпадаеш у мора ў раёне гданьска і гдыні

вільготны вецер зранку мазгі прамывае
звіліны вашых маршрутаў – на гданьскіх мапах
міма цябе пралятаюць аблокі птушкі трамваі
караблі з вэстэрплятэ і электрычкі на мальбарг

вучыш замежныя мовы па караоке
джаз-фэстывалі чаек на молах і пірсах
кожная дзеўка анёл найчасцей каравокі
на языках без касцей сустракаецца пірсінг

у плянэтарыі спіш пад коўдрай вялікай мядзведзіцы
і загараеш пад хмарным небам на злосць прагнозам
істота якая здалёк чырвонаю скураю свеціцца
выкладчык ліцэю паэт з абгарэлым носам

а потым дашлеш па пошце альбо напішаш у посце
верш-апраўданне сам сабе абаронца
што ты тут паводзіўся як і належыць госцю
не згараў на буйках і не заплываў за сонца

***Заданне 2 (у парах). Прааналізуйце ўрывак верша, карыстаючыся прапанаваным планам:***

*1) Сістэма вершаскладання: сілабічная, сілаба-танічная, танічная.*

*2) Вызначце памер верша:*

*Сілабічны: васьміскладовік, адзінаццаціскладовік, трынаццаціскладовік і г. д.*

*Сілаба-танічны: ямб, харэй, дактыль, амфібрахій, анапест (заўвага: памер вызначаецца па схеме метр + колькасць стопаў, да прыкладу Ам3, Я5; лагаэд (стопны, радковы, строфны), вольны верш.*

*Танічны: акцэнтны, акцэнтна-складовы, дольнік, тактавік.*

*3) Вызначце ўсе адхіленні ад метрычнай схемы, якія робяць інтанацыю і рытм верша непаўторным, і ўкажыце іх месцы:*

*а) пірыхіі;*

*б) спандэі;*

*в) праклітыка і энклітыка;*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*г) сцяжэнне або расцяжэнне вершарадоў;*
*д) сцяжэнне стопаў;*
*е) з'яўленне ці знікненне анакрузы;*
*ж) дыярэза ці сінярэза.*

**1) М. Башлакоў**
З неба бяздоннага кропляй расы
Скоціцца сум на шляхі Беларусі.
І на лясы, залатыя лясы,
З ветрам таксама і я памалюся…

**2) В. Дэбіш**
Я не ведаю, як зразумець гэты свет,
Дзе пануе блюзнерства, падман і знямога,
Дзе бязлюднай дарогаю крочыць паэт
У шуканнях і праўды зямное, і Бога.

**3) В. Дэбіш**
Кудысь баімся не паспець
Пакутуем, сябе губляем.
Жыццё – кароткі міг. А смерць?
Ёсць – вечнасць. Смерці не бывае.

**4) М. Багдановіч**
Ўзрывайце ж іх санямі, коні!
Звіні, вясёлых бомаў медзь!
Вакол лятуць бары і гоні,
Ў грудзях пачала кроў кіпець.

**5) С. Грахоўскі**
Чалавеку патрэбна усмешка
Незнаёмых вачэй і знаёмых,
Каб дажджамі размытая сцежка
Стала лёгкай на кручах і стромах.

**6) А. Вярцінскі**
Мужчына. Жанчына. Чаканне.
Шуканне. Блуканне. Час.
Жанчына. Мужчына. Спатканне.
Вітанне. Пытанне. Адказ.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**7) Я. Купала**
Утварыў з яе з-пад шчасцяў сваё –
Чарадзейную княжну з аповесці дзіўнай,
І пад ногі ёй кінуў жыццё сваё ўсё...
А яна?.. А яна была толькі... дзяўчына!..

**8) Н. Мацяш**
На Ваша "ты" сказаць Вам "ты" не смею,
І калі позірк позіркам злаўлю,
Як птушанё, спалохана нямею.
Я не кахаю Вас. Я Вас люблю.

**9) Р. Барадулін**
Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою не ачарсцвець,
Каб не страціць святое штосьці.

**10) М. Багдановіч**
Ў белай пене праносяцца коні, –
Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

***Заданне 3 (франтальнае). Вызначце сістэму вершаскладання. Абгрунтуйце свой адказ.***

**1) М. Багдановіч**
Ў космах схаваліся кветы
чырвоныя,
Кветы чырвоныя,
Неапылёныя.

Хцівасць жадання іх токіць
таёмная,
Токіць таёмная,
Сіла няскромная.

Але дарэмна ў іх сокі б'юць
шпаркія,
Сокі б'юць шпаркія,
Свежыя, яркія.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Звянуць яны, тыя кветы
чырвоныя,
Кветы чырвоныя
Неапылёнымі.

**2) А. Пісьмянкоў**
Сявенька для жыта,
Меч старажытны.

Шолам з Нямігі,
Скарынава кніга.

Ад каня Кастусёва
На шчасце падкова.

**3) У. Арлоў**
Спілавалі дрэва – няма на пнішчы
гадавых кольцаў.
Але гэта дрэва – пераконваю сябе.
Знаёмы паляўнічы кажа: упаляваў
зайца, ні кроплі крыві не было ў яго.
Але гэта заяц...
Лётаюць над травеньскім полем
безгалосыя жаўрукі...
Але гэта жаўрукі...

Ідзе насустрач мне чалавек.
Гэта чалавек – пераконваю сябе.

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ 6
## ПРЫНЦЫПЫ АНАЛІЗУ МАСТАЦКАГА ТВОРА; АСНОЎНЫЯ ЭЛЕМЕНТЫ ЗМЕСТУ

1 Прынцыпы аналізу і шляхі разгляду літаратурнага твора.
2 Адзінства зместу і формы – асноўны закон мастацтва.
3 Асноўныя складнікі зместу твора: тэма, праблема, ідэя.
4 Асноўныя складнікі зместу твора: канфлікт і пафас.

***Заданне для падрыхтоўкі дома*: *прачытаць творы*:**
**1) аповесць Людмілы Рублеўскай “Дзеці гамункулуса”.**

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Змешчана ў часопісе “Полымя”. – 2000. – № 7. – С. 20–65. Або ў зборніку Карона Вітаўта Вялікага: раманы, аповесці, апавяданні / уклад. У. М. Сіўчыкава, А. У. Сіўчыкавай. – Мінск : Маст. літ., 2004. – 510 с.

**2) аповесць С. Мінскевіча Рок@нат: фэнтэзі ++**

Друкавалася ў часопісе “Маладосць”. – 2010. – №2. – С. 11–61.
Архіў часопіса ў сеціве: http://www.lim.by/limbyfiles/mal2_2010.pdf

## Літаратура


1 Яцухна, В. І. Тэорыя літаратуры : вучэбны дапаможнік для студэнтаў-філолагаў ВНУ : у 2 ч. Ч. 2 / В. І. Яцухна. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2003. – С. 17–31, 36–41, 52–56.

2 Введение в литературоведение : учебное пособие / Л. В. Чернец [и др.]; под ред. Л. В. Чернец. – Москва : Высш. шк., 2004. – 680 с.

3 Введение в литературоведение : учебник / Н. Л. Вершинина [и др.]; под общ. ред. Л. М. Крупчанова. – Москва : Издательство Оникс, 2005. – 416 с.

4 Лазарук, М. А. Уводзіны ў літаратуразнаўства / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Вышэйшая школа, 1982. – 277 с.

5 Лазарук, М. А. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Нар. асвета, 1983. – 191 с.

6 Суслова, Н. В. Новейший литературоведческий словарь-справочник для ученика и учителя / Н. В. Суслова. – Мозырь : ООО ИД “Белый Ветер”, 2003. – 152 с.

7 Рагойша, В. П. Уводзіны ў літаратуразнаўства: Вершаванне / В. П. Рагойша. – Мінск : БДУ, 2003 (2004) ***(электронны варыянт падручніка ёсць у сеціве)***.

8 Борев, Ю. Б. Эстетика. Теория литературы: Энциклопедический словарь терминов / Ю. Б. Борев. – Москва : ООО “Изд-во Астрель”, ООО “Изд-во АСТ”, 2003. – 575 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ 7
## ФОРМА ЛІТАРАТУРНАГА ТВОРА

1 Сюжэт як зместава-фармальны кампанент твора.

2 Персанаж, тып, характар як самастойныя адзінкі мастацкай арганізацыі тэксту.

3 Кампазіцыя твора і яе асноўныя разнавіднасці.

***Заданне для падрыхтоўкі дома: прачытаць творы:***

**1) аповесць Алены Брава “Бязлітасны мой воін”.**

Змешчана ў часопісе Крыніца. – 2001. – №9. – С. 39–67

Або ў зборніку "Рай даўно перанаселены" – Мінск : Галіяфы, 2012. – 276 с.

**2) апавяданне В. Быкава "Ружовы туман".**

Змешчана ў сеціве: http://knihi.com/Vasil_Bykau/Sciana.html#chapter5

Вызначыць (пісьмова):

- этапы сюжэта і яго від (даказаць прыналежнасць да гэтага віду);
- асноўныя матывы;
- колькасць персанажаў галоўных, другарадных і эпізадычных;
- колькасць з іх характараў і тыпаў;
- наяўнасць сродкаў псіхалагізму, пералічыць іх;
- адметнасці кампазіцыі, яе від і прыёмы, тып факалізацыі.

## Літаратура


1 Яцухна, В. І. Тэорыя літаратуры : вучэбны дапаможнік для студэнтаў-філолагаў ВНУ : у 2 ч. Ч. 2 / В. І. Яцухна. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны. – 2003. – С. 17–31, 36–41, 52–56.

2 Введение в литературоведение : учебное пособие / Л. В. Чернец [и др.]; под ред. Л. В. Чернец. – Москва : Высш. шк., 2004. – 680 с.

3 Введение в литературоведение : учебник / Н. Л. Вершинина [и др.]; под общ. ред. Л. М. Крупчанова. – Москва : Издательство Оникс, 2005. – 416 с.

4 Лазарук, М. А. Уводзіны ў літаратуразнаўства / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Вышэйшая школа, 1982. – 277 с.

5 Лазарук, М. А. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Нар. асвета, 1983. – 191 с.

6 Суслова, Н. В. Новейший литературоведческий словарь-справочник для ученика и учителя / Н. В. Суслова. – Мозырь : ООО ИД "Белый Ветер", 2003. – 152 с.

7 Рагойша, В. П. Уводзіны ў літаратуразнаўства: Вершаванне / В. П. Рагойша. – Мінск : БДУ, 2003 (2004) ***(электронны варыянт падручніка ёсць у сеціве)***.

8 Борев, Ю. Б. Эстетика. Теория литературы: Энциклопедический словарь терминов / Ю. Б. Борев. – Москва : ООО "Изд-во Астрель", ООО "Изд-во АСТ", 2003. – 575 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ 8
## ІНШАСКАЗАЛЬНАСЦЬ ЯК ФУНКЦЫЯ МОВЫ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1 Паняцце тропаў, іх функцыі і тыпалогія.

2 Метафарычныя тропы (метафара, параўнанне, увасабленне, адухаўленне, персаніфікацыя, сімвал, алегорыя, катахрэза, паралелізм, аксюмаран, эпітэт).

3 Метанімічныя тропы (метанімія, сінекдаха, антанамазія, перыфраза, эўфемізм, дысфемізм).

4 Іншыя віды тропаў (іронія, сарказм, гратэск, інвектыва, гіпербала, літота).

***Заданне для падрыхтоўкі дома:*** **выпісаць і ведаць азначэнні такіх тропаў, як *іронія, сарказм, гратэск, інвектыва, гіпербала, літота, алюзія, рэмінісцэнцыя, апастрофа, сінестазія.***

## Літаратура


1 Рагойша, В. Паэтычны слоўнік / В. П. Рагойша. – Мінск : Вышэйшая школа, 1987. – С. 77–115.

2 Введение в литературоведение : учебное пособие / Л. В. Чернец [и др.]; под ред. Л. В. Чернец. – Москва : Высш. шк., 2004. – 680 с.

3 Введение в литературоведение : учебник / Н. Л. Вершинина [и др.]; под общ. ред. Л. М. Крупчанова. – Москва: Издательство Оникс, 2005. – 416 с.

4 Лазарук, М. А. Уводзіны ў літаратуразнаўства / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Вышэйшая школа, 1982. – 277 с.

5 Лазарук, М. А. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Нар. асвета, 1983. – 191 с.

6 Суслова, Н. В. Новейший литературоведческий словарь-справочник для ученика и учителя / Н. В. Суслова. – Мозырь : ООО ИД “Белый Ветер”, 2003. – 152 с.

7 Борев, Ю. Б. Эстетика. Теория литературы: Энциклопедический словарь терминов / Ю. Б. Борев. – Москва : ООО “Изд-во Астрель”, ООО “Изд-во АСТ”, 2003. – 575 с.

8 Рагойша, В. П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах / В. П. Рагойша. – Мінск : Белэнцыклапедыя, 2001. – 384 с.

9 Рагойша, В. П. На шляху да Парнаса. Даведнік маладога літаратара / В. П. Рагойша. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 158 с.

10 Уэллек, Р. Теория литературы / Р. Уэллек, О. Уоррен. – Москва : Прогресс, 1978. – С. 202–229.


***Заданне 1. Прааналізаваць урывак з “Энеіды навыварат” В. Равінскага, карыстаючыся наступным планам:***

*1 Вызначыць адметнасць стылю: аўталагічны ці металагічны.*

*2 Знайсці ўсе метафары і вызначыць іх від:*

*а) простыя ці складаныя;*

*б) паводле якога прынцыпу ўтвораны;*

*в) знайсці сярод іх прозапапеі і персаніфікацыі, зваротныя метафары, катахрэзы.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*3 Знайсці іншыя метафарычныя тропы: аксюмаран, параўнанне (і вызначыць сродкі яго выражэння і віды), паралелізм, сімвалы і алегорыі.*

*4 Знайсці эпітэты і вызначыць іх від (метафарычныя, метанімічныя, гіпербалічныя, іранічныя, сталыя).*

*5 Знайсці:*

*а) якасныя метаніміі і вызначыць іх від;*

*б) сінекдахі і іх віды.*

*6 Знайсці іншыя метанімічныя тропы (перыфразы, эўфемізмы, дысфемізмы).*

*7 Знайсці формы мадыфікацыі смеху (іронія, сарказм, гратэск, інвектыва, гіпербала, літота).*

*8 Вызначыць функцыі вылучаных тропаў.*

**Варыянт 1**

Ды грэкі нуйму[1] нарабілі:
Як ляда, Трою[2] ўсю спалілі.
Кашэль ён згробшы – наўцёк,
І, швыдка зробіўшы чаўнок,
Траянцамі яго набіў
Ды ў мора з імі ён паплыў.
Але Юнона[3], баба злая, –
Адроддзя панскага, ліхая! –
Шукала ўсё яго згубіць,
На дно у пекла пасадзіць.
За тое, бачыш, неўзлюбіла,
Яго Венера[4] што радзіла.
Юнона воблак адапхнула
Ды з неба на мара зірнула –
Плыве на чаўнаку Эней!
"Ах ты, някруціна[5], зладзей!
Вось я цябе скручу ў табаку,
Ражном у мора, як сабаку!"

[1] У сэнсе шмат, многа.

[2] Троя – галоўны горад Траады, разбураны грэкамі ў легендарную Траянскую вайну. (Траада – вобласць у Малой Азіі.)

[3] Згодна з рымскай міфалогіяй – багіня месяца, крыху пазней – багіня сямейнага дабрабыту, пакравіцельніца жанчын і шлюбу.

[4] Багіня кахання і харасства.

[5] Прахвост, шэльма.

**Варыянт 2**

"Калі, сват, зробіш тую чэсць,
То я дзявухну украсіву,
Салодкую, як з мёдам сліву,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Табе за тое прывяду".
Эол расшупіў[6] тое дзела, –
З яго аж слюнка пацякла –
Любіў ён цешыць грэшна цела,
Дзявухна па нутру была.
<…>
"А я ўсё зраблю, грамадзею!
Са ўсіх глуздоў іх сцебану,
З траянцаў выцісну алею,
На дно у мора заганю!
Твайго ж пабольша ліхадзея,
Некрута гэтага Энея,
Я так папру яго вятрамі,
Аж булькаць будзе пузырамі,
Як сторч у вір ўсіх галавой
Наменік[7] сцягне за сабой"

[6] Зразумеў, расшалопіў, разабраўся.
[7] Ужываецца тут у сэнсе "чорт", вадзянік.

**Варыянт 3**
Калі хто відзеў, як Бакціха[8]
Нямецка піва задаець,
Яко яно падымець ліха,
Запеніцца ды розна прэць, –
От так і мора заравела,
Бублілась, пенілась, шумела.
Эней спалохаўся, ўсхадзіўся.
Матуз ад портак аж зваліўся,
Са страху й нюні распусціў
Ды, як у трасцы, ён завыў.
Траянцы ўсе казлы задралі,
Са ўсіх чаўноў яны гукалі,
Ў балоце быдта лісавей,
Ачухаўшысь, ўскрычаў Эней:
«О, цар-царэвіч, тат Нептун[9]!
Не буду прад табой брахці,
Змілуйся, мора ты зміры.
Картузнай[10] я прышлю цяртухі[11],
Сударскай[12] моцнае сівухі,
А грошы з тайстры[13] сам бяры!"

[8] У Віцебскай рэдакцыі "Энеіды навыварат" Бакціха – прозвішча ўтрымальніцы піўнога пограба ў Бешанковічах Віцебскай губерні. У Смаленскай рэдакцыі "Энеіды навыварат" Бак – вядомы ў тыя часы півавар у г. Смаленску.
[9] Адзін з галоўных багоў рымскай міфалогіі, бог мора, пакравіцель мораплавання.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

[10] Цудоўная, добрая, якая захоўваецца ў картузе.
[11] Нюхальнай табакі.
[12] Гасударскай, царскай.
[13] Тайстра – кайстра – вешчавы мяшок. (У тэксце ўжыта ў сэнсе грашовы мяшок, каліта.)

**Варыянт 4**

Нептун на грошы меў ахвоту,
Гарэлку добра ён сцябаў,
Пачуў, што будзе за работу,
На ветраў строга закрычаў:
“А вон, нячысты некруціны!
З якой фантазіі вы тут?!
Глядзі, скаштуеце дубіны,
І ноздры вам ражном утруць!”
Вось досыць ветрам тут дзякацца[14], –
З Нептунам зналі, які жарт, –
Дамоўкі сталі убірацца,
Як ад Кутуза Банапарт[15].
Тут раптам неба спагадзелась,
Усплыла сонейка, з’яснелась,
Эней, уцёкшы так ад бед,
Састрапаць загадаў абед.
Траянцы ўзяліс за ядзенне,
Як з поля панскія харты[16]
Была ў іх з затаўкай крупеня,
Кулагу[17] пхалі ў жываты…

[14] Здзекуецца.
[15] Ад Кутузава Банапарт.
[16] Гончыя сабакі.
[17] Ежа, прыгатаваная з густа заваранай жытняй мукі.

**Варыянт 5**

Плыў, плыў, аж уваччу зазелянелась,
І мора горш ад талакна прыелась –
Ён ведзьмай на яго глядзеў.
А там пачаў ужо здзікацца
Ды так ні к чому стаў злавацца,
Што я й пісаць тут не пасмеў.
Казаў, што “лепш бы на пагосце
Схаўтурылі мае там косці,
Дарэмна з Троі пакруціўся
Ды валачобнічаць пусціўся”.
Ён з гора піпку запаліў,
Ў балону галаву спусціў.
Аж зірк у мора – і сказіўся,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Запеў "Ізбранную"[18], заксціўся:
"Глядзеце, братцы, вунь сяло!"
Тут ўсіх за сэрца узяло.

[18] Малітву "Взбранной воеводе".

**Варыянт 6**
А Зеўс тады сядзеў у клеці,
Гарэлку з мёдам там сцябаў,
Без сораму, як малы дзеці,
З падоння пальцам калупаў.
Прыйшла Венера і завыла,
Саплямі змазала ўсё рыла
Й так зазюзюкала яна:
"А чым перад табою, бацька,
Мой абмішуліўся[19] дзіцяцька?
Зюкні, яка яго віна?
Не ўвідзяць Рыму яго вокі,
Калі Юнону не уймеш!
Звядуць на ростанях сарокі,
Сатрэць яна яго ў кулеш".
Тут Зеўс, гарэлачку дапіўшы,
Ражком ў халяву пастучаў,
Цяртухі моцнае зажыўшы,
Таку гаворку распачаў:
"Дапрэ Энеянка да Рыму
І будзе тама ён царом.
Палепшы Чыжаўскіх харом
Паставіць каменны палаты".

[19] Праштрафіўся, памыліўся.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ 9
# ФОНІКА І ІНТАНАЦЫЙНА-СІНТАКСІЧНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ТЭКСТУ ЯК ВАЖНЕЙШЫЯ КАМПАНЕНТЫ ЯГО МАСТАЦКАЙ ЦЭЛАСНАСЦІ

1 Паэтычная фанетыка і яе элементы.

2 Інтанацыя і яе кампаненты; семантычныя рытарычныя фігуры ў мастацкім тэксце (градацыя, рэтардацыя, ампліфікацыя, каламбур, антытэза, рытарычнае пытанне, вокліч, зваротак).

3 Сінтаксічныя стылістычныя фігуры:

а) фігуры змяншэння (эліпсіс, апасіяпеза (умаўчанне, абрыў), асіндэтон);

б) фігуры дадавання (анадзіплозіс (эпанастрафа), полісіндэтон);

в) фігуры перастаноўкі (інверсія, паралелізм, ізакалон, хіязм, анафара, эпіфара (эпістрафа), сімплака, анжамбеман, анакалуф).

## Літаратура


1 Рагойша, В. Паэтычны слоўнік / В. П. Рагойша. – Мінск : Вышэйшая школа, 1987. – С. 77–115.

2 Введение в литературоведение : учебное пособие / Л. В. Чернец [и др.]; под ред. Л. В. Чернец. – Москва : Высш. шк., 2004. – 680 с.

3 Введение в литературоведение : учебник / Н. Л. Вершинина [и др.]; под общ. ред. Л. М. Крупчанова. – Москва : Изд-во Оникс, 2005. – 416 с.

4 Лазарук, М. А. Уводзіны ў літаратуразнаўства / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Вышэйшая школа, 1982. – 277 с.

5 Лазарук, М. А. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Нар. асвета, 1983. – 191 с.

6 Суслова, Н. В. Новейший литературоведческий словарь-справочник для ученика и учителя / Н. В. Суслова. – Мозырь: ООО ИД “Белый Ветер”, 2003. – 152 с.

7 Борев, Ю. Б. Эстетика. Теория литературы: Энциклопедический словарь терминов / Ю. Б. Борев. – Москва : ООО “Изд-во Астрель”, ООО “Изд-во АСТ”, 2003. – 575 с.

8 Рагойша, В. П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах / В. П. Рагойша. – Мінск: Белэнцыклапедыя, 2001. – 384 с.

9 Рагойша, В. П. На шляху да Парнаса. Даведнік маладога літаратара / В. П. Рагойша. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 158 с.

10 Уэллек, Р. Теория литературы / Р. Уэллек, О. Уоррен. – Москва : Прогресс, 1978. – С. 202–229.


***Заданне 1 (франтальнае). Знайсці ў вершах усе сродкі паэтычнай фанетыкі і сінтаксісу (рытарычныя фігуры).***

**Джэці**

**Занадта вясёлая**

Я вясёлая занадта дзеўка.
Пры занадта сумным існаванні
Я – бы недарэчная прыпеўка
На грамадзка значным пахаванні.

Я – нібы агністая вавёрка
На застыла-чорным мёртвым дрэве.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

І, запнуўшыся на ўласным спеве,
Я сяджу і плачу горка-горка.

**Беражэце зубы!**
Я мыкала ў трубку старанна
З усмешкаю скрыўленых губ,
І ты зразумеў, мой каханы,
Што сёння мне вырвалі зуб.

І я засталася без зуба.
Цяпер ён чакае мяне
Ў тым месцы, дзе мы з табой, любы,
Бываем пакуль толькі ў сне.

А сніцца нам змрочная сцежка,
І зорачкай ззяе над ёй
Дзявоча-бяззубая ўсмешка
З прыгожай і чыстай душой.

**Руку да нагі**
Прывязалі мне руку да нагі,
Але вельмі добрыя людзі.
Не каб нехта благі!
А ад добрых – няхай ужо будзе!

**ЗЯМЛЯ**
Закувала зязюля
Званары загулі
Земляробы зрабілі
Заваліся зямлі
Засінелі засосы
З-за завалаў зямлі
Зыкам звонкагалосым:
“Задзяўблі! Задзяўблі!”
*(Зіга Зюзінскі)*

**ЭЛЕГІЯ № 1**
Я зусім яшчэ маладая,
Але ўпала на галаву

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

І нікога больш не кахаю
І наогул больш не жыву.

***Заданне 2 (самастойнае). Знайсці ў вершах усе сродкі паэтычнай фанетыкі і сінтаксісу (рытарычныя фігуры).***

**Варыянт 1**
**У. Арлоў**
Спілавалі дрэва – няма на пнішчы
гадавых кольцаў.
Але гэта дрэва – пераконваю сябе.
Знаёмы паляўнічы кажа: упаляваў
зайца, ні кроплі крыві не было ў яго.
Але гэта заяц...
Лётаюць над травеньскім полем
безгалосыя жаўрукі...
Але гэта жаўрукі...

Ідзе насустрач мне чалавек.
Гэта чалавек – пераконваю сябе.

**Віка Трэнас**
**Смерць у снежні**
шлях да Бога ляжыць праз страўнік
смерць у снежні ды смерць у траўні
цёмна вершам, нібы ў труне
ува мне

наш лёс – герой крымінальных хронік
памыем рукі, паголім скроні
цесна вершам, нібы ў труне
ува мне
яшчэ жывы, нас мінае студзень
стварайце цуды, святыя суддзі
страшна вершам, нібы ў труне
ува мне

**Варыянт 2**
**У. Арлоў**
**Воблака**
Кожны дзень праплывае нада мною высокае
воблака з тонкім жаночым профілем.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Што гаворыць мне неба?
Нагадаць хоча тую, з якой развітаўся?
Але я не пазнаю яе.
Кажа пра тую, якую кахаю?
Але я не пазнаю яе.
Прарочыць тую, якую сустрэну?
Але я не пазнаю яе.
Дзень пры дні праплывае па небе высокае воблака з тонкім жаночым профілем.
Дзень пры дні бачу слёзы на вейках у той, што кахаю.
Дзень пры дні завешваю раніцай вокны.
Але там, за шторамі, плыве па небе высокае воблака з тонкім жаночым профілем.

**Віка Трэнас**
**Улетку на рынку**
у завулку чарговых фантазій цёмна
і на вуліцы пекных рыфмаў душна
на праспекце шматлікіх верлібраў сцёбна
я іду, адчуваю сябе нязмушана
манекены метафар жывуць за вітрынамі
параўнанняў каралі ляжаць карцінна
ды я тут ні пры чым, я гандлюю цытрынамі
так што, мілы паэта, праходзьце міма

**Варыянт 3**
**У. Арлоў**
**Жорны**
Знайду ў цётчыных сенцах жорны, выцягну на парог, крутану рукавятку...
Засмяюцца жорны голасам маці,
запяюць голасам бабы Аўгінні,
вылаюцца голасам дзеда Максіма.
Адале загавораць галасамі незнаёмымі і ўсё болей незнаёмых слоў пачую я.
Адале замаўчаць цётчыны жорны, хоць і будуць круціцца, – адно даляціць аднекуль пошчак капытоў.

Крутану назад рукавятку –
зноў данясецца пошчак далёкі.
Зноў пачую галасы незнаёмыя,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і дзедаву лаянку,
і бабуліну песню,
і мамін смех.
І зноў анямеюць жорны.

Марна буду круціць рукавятку:
не пачую я свайго голасу,
не пачую голасу сына Рамана,
і голасу сына Багдана,
і голасу ўнука...

Хто запомніць?
Хто пачуе?
Хто зразумее
галасы нашы?

**Віка Трэнас**
Я склала зброю. Стаптала боты.
Зламала кіпці. Пайшла дадому.
Бо хто шчаслівы, бо хто журботны
Адчыніць дзверы майму малому?
Дзяліўшы, рэзаў мяне на вершы,
Не знаўшы, шкодзіў сабе самому.
Праз колькі дзён безгаловы вершнік
У дом, бы котку, запусціць стому.
Лязо далоняў
Вастрыла сёньня
Паслала сон на
Паслала ўсё

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ 10
## ЛІТАРАТУРНАЯ ПЛЫНЬ, ШКОЛА І ІХ РОЛЯ Ў МАСТАЦКІМ ПРАЦЭСЕ

1 Літаратурная плынь як разнавіднасць літаратурнага напрамку; літаратурная групоўка і школа.

2 Разнастайнасць літаратурных плыней канца XIX–XX стагоддзяў (сімвалізм, акмеізм, імажынізм, імпрэсіянізм, футурызм).

3 Асноўныя літаратурныя плыні XX стагоддзя (экспрэсіянізм, сюррэалізм, экзістэнцыялізм).

4 Мастацтва постмадэрнізму.
5 Стыль барока.

## Літаратура

1 Лявонава, Е. А. Плыні і постаці: з гісторыі сусветнай літаратуры другой паловы XIX–XX стагоддзяў / Е. А. Лявонава. – Мінск : Рэд. часоп. "Крыніца", 1998. – 336 с.
2 Борев, Ю. Б. Эстетика : в 2 т. Т. 2 / Ю. Б. Борев. – Смоленск : Русич, 1997. – 640 с.
3 Введение в литературоведение : учебник / Н. Л. Вершинина [и др.]; под общ. ред. Л. М. Крупчанова. – Москва : Издательство Оникс, 2005. – 416 с.
4 Лазарук, М. А. Уводзіны ў літаратуразнаўства / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Вышэйшая школа, 1982. – 277 с.
5 Лазарук, М. А. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Нар. асвета, 1983. – 191 с.
6 Суслова, Н. В. Новейший литературоведческий словарь-справочник для ученика и учителя / Н. В. Суслова. – Мозырь : ООО ИД "Белый Ветер", 2003. – 152 с.
7 Борев, Ю. Б. Эстетика. Теория литературы: Энциклопедический словарь терминов / Ю. Б. Борев. – Москва : ООО "Изд-во Астрель", ООО "Изд-во АСТ", 2003. – 575 с.
8 Рагойша, В. П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах / В. П. Рагойша. – Мінск : Белэнцыклапедыя, 2001. – 384 с.
9 Рагойша, В. П. На шляху да Парнаса. Даведнік маладога літаратара / В. П. Рагойша. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 158 с.
10 Уэллек, Р. Теория литературы / Р. Уэллек, О. Уоррен. – Москва : Прогресс, 1978. – С. 202–229.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ 11
## ТВОРЧАЯ ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦЬ І СТЫЛЬ ПІСЬМЕННІКА

1 Мастацкі метад, тып мыслення і творчая эвалюцыя пісьменніка.
2 Творчая індывідуальнасць мастака слова.
3 Стыль як эстэтычнае адзінства ўсіх кампанентаў зместу і формы слова.

## Літаратура

1 Творческая индивидуальность писателя: теоретические аспекты изучения : сб. материалов Междунар. научной конф. / ред.-составитель

Л. П. Егорова. – Ставрополь : изд-во Ставропольского гос. ун-та, 2008. – 296 с. ***(зборнік ёсць у сеціве)***

2 Введение в литературоведение : учебник / Н. Л. Вершинина [и др.]; под общ. ред. Л. М. Крупчанова. – Москва : Издательство Оникс, 2005. – 416 с.

3 Лазарук, М. А. Уводзіны ў літаратуразнаўства / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Вышэйшая школа, 1982. – 277 с.

4 Лазарук, М. А. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Нар. асвета, 1983. – 191 с.

5 Суслова, Н. В. Новейший литературоведческий словарь-справочник для ученика и учителя / Н. В. Суслова. – Мозырь : ООО ИД “Белый Ветер”, 2003. – 152 с.

6 Рагойша, В. П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах / В. П. Рагойша. – Мінск : Белэнцыклапедыя, 2001. – 384 с.

7 Рагойша, В. П. На шляху да Парнаса. Даведнік маладога літаратара / В. П. Рагойша. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 158 с.

8 Уэллек, Р. Теория литературы / Р. Уэллек, О. Уоррен. – Москва : Прогресс, 1978. – С. 202–229.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# 2 САМАСТОЙНАЯ КАНТРАЛЮЕМАЯ РАБОТА

## КСР 1
## ЛІТАРАТУРА ЯК АСНОЎНЫ ПРАДМЕТ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

1 Спецыфіка літаратуры як вобразна-слоўнага мастацтва.
2 Літаратура і яе ўзаемасувязь з іншымі відамі мастацтва.
3 Паняцце эстэтычнага ідэалу.
4 Гуманістычная скіраванасць прыгожага пісьменства.

***Заданне на 4–6 балаў: напісаць канспект тэмы (у выпадку выкарыстання рускамоўных крыніц іх неабходна перакладаць).***

***Заданне на 7–10 балаў: скласці крыжаванку з літаратуразнаўчых тэрмінаў.***

*Патрабаванні:*

- лаканічнасць і змястоўнасць фармуліровак;
- адказы павінны быць упісаны ў графічную схему;

*Крытэрыі ацэнкі:* пры якаснасці выканання акрэсленых вышэй патрабаванняў крыжаванка, якая ўтрымлівае 20–30 паняццяў, ацэньваецца ў 7 балаў, 30–40 паняццяў – 8 балаў, 40–50 паняццяў – 9 балаў, звыш 60 паняццяў – 10 балаў.

## Літаратура


1 Уводзіны ў літаратуразнаўства : у 2 ч. Ч. 1: Літаратуразнаўства як навука. Эстэтыка літаратуры. Паэтыка / пад рэд. праф. В. П. Рагойшы. — Мінск : БДУ, 2009. – 208 с. ***(электронны варыянт падручніка ёсць у сеціве)***

2 Введение в литературоведение : учебник / Н. Л. Вершинина [и др.]; под общ. ред. Л. М. Крупчанова. – Москва : Издательство Оникс, 2005. – 416 с.

3 Андреев, А. Н. Целостный анализ литературного произведения : учеб. пособие для студентов вузов / А. Н. Андреев. – Минск : НМЦентр, 1995. – 144 с.

4 Введение в литературоведение / под ред. Г. Н. Поспелова. – Москва : Изд-во МГУ, 1985. – 245 с.

5 Волков, И. Ф. Теория литературы : учебное пособие для студентов и преподавателей / И. Ф. Волков. – Москва : Просвещение; Владос, 1995. – 256 с.

6 Западное литературоведение XX века : энциклопедия / гл. научн. ред. Е. А. Цурганова. – Москва : Intrada, 2004. – 560 с.

7 Лазарук, М. А. Уводзіны ў літаратуразнаўства / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Вышэйшая школа, 1982. – 277 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

8 Лазарук, М. А. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Нар. асвета, 1983. – 191 с.

9 Рагойша, В. П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах / В. П. Рагойша. – Мінск : Белэнцыклапедыя, 2001. – 384 с.

10 Руднев, В. Энциклопедический словарь культуры XX века: ключевые понятия и термины / В. Руднев. – Москва : Аграф, 2001. – 608 с.

11 Суслова, Н. В. Новейший литературоведческий словарь-справочник для ученика и учителя / Н. В. Суслова – Мозырь : ООО ИД "Белый Ветер", 2003. – 152 с.

## КСР 2
## МОВА ТВОРА ЯК АСНОЎНЫ ЭЛЕМЕНТ ФОРМЫ І ЯЕ ФУНКЦЫІ

1 Мова як першаэлемент літаратуры, мова вершаваная і празаічная.

2 Агульнанародная лексіка: сінонімы, антонімы, амонімы і іх віды ў мастацкай літаратуры.

3 Народная фразеалогія і спецыфічная лексіка ў складзе мовы мастацкіх тэкстаў.

4 Лексіка абмежаванага выкарыстання ў мастацкім творы.

***Заданне: напісаць канспект тэмы (у выпадку выкарыстання рускамоўных крыніц іх неабходна перакладаць).***

## Літаратура

1 Введение в литературоведение : учебник / Н. Л. Вершинина [и др.]; под общ. ред. Л. М. Крупчанова. – Москва : Издательство Оникс, 2005. – С. 50–54.

2 Уводзіны ў літаратуразнаўства : у 2 ч. Ч. 1 : Літаратуразнаўства як навука. Эстэтыка літаратуры. Паэтыка / пад рэд. праф. В. П. Рагойшы. – Мінск : БДУ, 2009. – 208 с. (II раздзел)

3 Лазарук, М. А. Уводзіны ў літаратуразнаўства / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Вышэйшая школа, 1982. – С. 96–111.

4 Яцухна, В. І. Тэорыя літаратуры : вучэбны дапаможнік для студэнтаў-філолагаў ВНУ : у 2 ч. Ч. 2 / В. І. Яцухна. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2003. – С. 41–45.

5 Есин, А. Б. Принципы и приемы анализа литературного произведения / А. Б. Есин. – М. : "Флинта", "Наука". – С. 72–82. ***(спампаваць у сеціве).***

6 Рагойша, В. П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах / В. П. Рагойша. – Мінск : Белэнцыклапедыя, 2001. – 384 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

7 Суслова, Н. В. Новейший литературоведческий словарь-справочник для ученика и учителя / Н. В. Суслова. – Мозырь : ООО ИД “Белый Ветер”, 2003. – 152 с.

8 Введение в литературоведение / под ред. Г. Н. Поспелова. – Москва : Изд-во МГУ, 1985. – 245 с.

## КСР 3
## ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС: ЯГО СТАДЫЯЛЬНЫЯ АГУЛЬНАСЦІ І МАСТАЦКІЯ НАПРАМКІ

1 Антычнае мастацтва і яго характарыстыка.

2 Сярэднявечча і яго асноўныя адзнакі.

3 Культура эпохі Адраджэння.

4 Канкрэтна-гістарычны характар узнікнення функцыянавання літаратурных напрамкаў (класіцызм, сентыменталізм, рамантызм, рэалізм, натуралізм, мадэрнізм).

***Заданне: напісаць канспект тэмы (у выпадку карыстання рускамоўнымі крыніцамі іх неабходна перакладаць).***

## Літаратура

1 Лявонава, Е. А. Плыні і постаці: з гісторыі сусветнай літаратуры другой паловы XIX – XX стагоддзяў / Е. А. Лявонава. – Мінск : Рэд. часоп. “Крыніца”, 1998. – 336 с.

2 Борев, Ю. Б. Эстетика : в 2 т. Т. 2 / Ю. Б. Борев. – Смоленск : Русич, 1997. – 640 с.

3 Введение в литературоведение : учебник / Н. Л. Вершинина [и др.]; под общ. ред. Л. М. Крупчанова. – Москва : Издательство Оникс, 2005. – 416 с.

4 Лазарук, М. А. Уводзіны ў літаратуразнаўства / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Вышэйшая школа, 1982. – 277 с.

5 Суслова, Н. В. Новейший литературоведческий словарь-справочник для ученика и учителя / Н. В. Суслова. – Мозырь : ООО ИД “Белый Ветер”, 2003. – 152 с.

6 Борев, Ю. Б. Эстетика. Теория литературы: Энциклопедический словарь терминов / Ю. Б. Борев. – М. : ООО “Изд-во Астрель”, ООО “Изд-во АСТ”, 2003. – 575 с.

7 Рагойша, В. П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах / В. П. Рагойша. – Мінск : Белэнцыклапедыя, 2001. – 384 с.

8 Рагойша, В. П. На шляху да Парнаса. Даведнік маладога літаратара / В. П. Рагойша. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 158 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# 3 НАЙБОЛЬШ СКЛАДАНЫЯ ПЫТАННІ ДЫСЦЫПЛІНЫ “УВОДЗІНЫ Ў ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА”

## 3.1 Антычнае (метрычнае) вершаскладанне і яго асаблівасці

Антычнае вершаскладанне ўзнікла ў VIII ст. да н. э. у Старажытнай Грэцыі, у III ст. да н. э. перайшло ў Рым. Гэтая сістэма можа ўжывацца толькі ў мовах, дзе галосныя адрозніваюцца па працягласці гучання (старажытнагрэчаская, ранняя латынь, арабская, персідская, славацкая, сербскахарвацкая і частка індыйскіх моў). Таму ў славянскіх літаратурах, у тым ліку ў беларускай, шырокага распаўсюджання не мела, а ўжывалася толькі ў перакладах ці стылізацыях. Больш за тое, калі ў рускай паэзіі XIX стагоддзя антычнае вершаскладанне набыло папулярнасць, то ў беларускай па прычыне амаль поўнай адсутнасці класіцыстычных твораў за ўсю гісторыю да метрычнага вершаскладання звярталіся толькі паэты-лацiністы (М. Гусоўскі, Ян Вісліцкі) і паэты пач. XX стагоддзя (М. Багдановіч, А. Дудар, У. Жылка і інш.). Тым не менш сілаба-танічная сістэма шмат запазычыла ад метрычнага вершаскладання: арганізацыю стапы, вершаванага радка і страфы, замяніўшы па аналогіі доўгія склады на націскныя, а кароткія – на ненацiскныя.

Антычнае (метрычнае) вершаскладанне належыць да квантытаўнага, у аснове якога – чаргаванне доўгіх ( – ) і кароткіх (U) складоў. Час, патрэбны для вымаўлення кароткага складу (тэзіса), называўся *морай*. Доўгі склад (арсіс) раўняўся дзвюм морам. У антычным вершаскладанні не было рыфмы, а чытанне вершаў суправаджалася напевам, што яшчэ больш узмацняла эфект вымаўлення доўгіх і кароткіх складоў. Першым прышчапіць антычнае вершаскладанне на славянскую глебу паспрабаваў М. Сматрыцкі, ён жа з’яўляецца і аўтарам першага славянскага метрычнага верша – “іранічнага” верша з кнігі “Грамматика словенска” (1618). Суразмернасць складоў утварала 28 стопаў, важнейшыя з якіх наступныя (табліца 1).

Табліца 1

| Двухскладовыя | Трохскладовыя |
|---|---|
| **U–** ямб | Дактыль **–U U** |
| **–U** трахей (харэй) | Амфібрахій **U–U** |
| **– –** спандэй | Анапест **U U–** |
| **U U** пірыхій | Амфімакр **– U –** |
| | Бакхій **U– –** |
| | Палімбакхій **– – U** |
| | Трыбрахій **U U U** |
| | Трымакр **– – –** |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Спалучэнне стопаў у вершаваным радку ўтварала *памеры, або метры,* адсюль і назва "метрычнае". Найбольш пашыранымі памерамі былі гекзаметр (эпічныя паэмы) і пентаметр (элегіі і эпіграмы).

*Гекзаметр* – шасцістопны памер, які спалучае пяць дактылічных і шостую харэічную стапу (усечаны дактыль), трэцяя стапа падзелена цэзурай (паўзай).

Схема: –U U | –U U | –U // U | –U U | –U U |–U

Менавіта гекзаметрам напісаны эпічныя паэмы "Іліяда" і "Адысея" Гамера, "Энеіда" Вергілія. Прыклад з беларускай літаратуры – "Дзень гневу" А. Дудара:

Рым і Элада заснулі ў палёце гадоў і стагоддзяў.
Мохам спавіты Акропаль, руінаю стаў Капітолій.

*Пентаметр* – пяцістопны памер: два падзеленыя цэзурай дактылічныя паўрадкоўі.

Схема: –U U | –U U | – // – | –U U | –U U

Па сутнасці, тут чатыры дактылі і падзелены цэзурай спандэй. Пентаметр звычайна спалучаўся з гекзаметрам, атрымаўшы назву элегічны двуверш:

Рыцар Няшчасце, што скрозь // ездзіць пад маскай маўчком,
Сэрца старое прабіў // мне зіхацяшчым мячом.
З сэрца старога струёй // люнуля ярая кроў;
Знікла пад сонцам яна, // ў зямлю ушла між цвятоў.

М. Багдановіч (пераклад П. Верлена)

## 3.2 Танічная сістэма вершаскладання і яе народна-песенныя вытокі

*Танічная сістэма вершаскладання* заснавана на чаргаванні прыблізна аднолькавай колькасці асноўных, або апорных, націскаў (іктаў) у радку пры рознай колькасці ненаціскных складоў паміж імі (ад нуля да васьмі). Літаратурны танічны верш склаўся ў сяр. XIX – пач. XX стагоддзя на аснове народнага вершаскладання, танічнага па сваёй прыродзе. Колькасць складоў у радку розная, месцы націску – розныя, але іх колькасць – пастаянная. Важную ролю адыгрываюць паўзы. Зарадзілася ў перыяд сінкрэтызму, калі паэзія і музыка былі непадзельным мастацтвам. У адрозненне ад літаратурнага народны танічны верш, як правіла, не мае рыфмы, бо галоўнае тут – мелодыя. У апошнім націск мае толькі рытмаваральныя функцыі, таму можа падаць на малазначныя для ідэі верша словы, нават службовыя, у літаратурным ён падае на найбольш значнае па сэнсе слова. Танічным вершам карысталіся Я. Купала,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

М. Багдановіч, М. Чарот, М. Танк, П. Панчанка, К. Кірэенка і шмат іншых. Выкарыстанне танічнага верша не тоеснае паняццю стылізацыі пад фальклор. Скажам, знакамітая рытміка У. Маякоўскага мае ўсе прыкметы танічнай сістэмы вершаскладання. У сучаснай культуры танічныя вершы – гэта многія тэксты рэп-музыкаў.

Мае некалькі асноўных **відаў** верша:

- акцэнтны (або чыста танічны);

Рака жыцця не прывыкла паказваць броды.
Яна несупынная ў паваротах сваіх.
І помыслы ў сэрцы людскім – глыбокія воды,
Ды чалавек разумны вычэрпвае іх.
<…>
Руплівасць не слухаецца пакорнай дагоды.
І сонца спасцігу ўзыходзіць з-пад вей.
Мялець не думаюць небародныя воды.
Чэрпае чалавек глыбей.

(Р. Барадулін)

- акцэнтна-складовы, які лічаць адметнай беларускай формай верша;

Я – калгасніца
Маладая,
Жыву весела,
Ані дбаю.

(Я. Купала)

- дольнік (паўзнік);

Гэта я з табой вечарую,
Туманамі цябе чарую.
Васількоў шапатліваю моваю
Зачароўваю, зачароўваю.
Роснай сцежкай, рэчкай ціхаю
Закалыхваю,
Закалыхваю.

(“Патухаюць, цямнеюць высі…” Г. Бураўкіна)

- тактавік.

Скучна мне ў глыбіне,  ў цішыне ;
Ўспамінаю я на дне аб вясне;
Я вясною пляснусь-ўскалыхнусь,
Зеляною муравой убярусь.

(“Русалка” М. Багдановіча)

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Табліца 2 – Манічная сістэма вершаскладання

| Крытэрыі параўнання | Акцэнтны | Акцэнтна-складовы | Дольнік (паўзнік) | Тактавік |
|---|---|---|---|---|
| *Колькасць складоў у радку* | розная | аднолькавая ці прыблізная | розная | розная |
| *Колькасць ненаціскных складоў паміж іктамі* | розная, ад 0 да 8 | 0–8 | розная, 1–2, не больш | розная, 0–1–2 (часцей), 1–2–3 (радзей) |
| *Ступень набліжанасці да сілаба-тонікі* | найменшая, бліжэй да народнага рэчытатыву | сярэдняя, захоўвае аднолькавую колькасць складоў у радках | найбольшая, сувязь з трохскладовымі метрамі. Не блытаць з лагаэдамі. Калі ў вершы больш за ¼ адхіленняў ад метрычнай сілаба-танічнай схемы – дольнік. | вялікая |
| *Дадатковыя характарыстыкі* | | 1) нярэдка мае цэзуру; 2) памер вымяраецца колькасцю акцэнтаў і складоў: АС2/5-4/ 3) як правіла, страфічны. | 1) паўзы – рытмастваральны кампанент; 2) спарадычны пропуск асноўных націскаў. | 1) могуць сустракацца радкі, напісаныя правільным Д, Ам ці Ан; 2) часта сустракаюцца звышсхемныя націскі; 3) пропускі асноўных націскаў рэдкія. |

## 3.3 Стылістычныя, або рытарычныя, фігуры

Пад *паэтычным сінтаксісам* разумеюць сэнсавыя, эмацыянальна-лагічныя суадносіны і размяшчэнне слоў у сказах, што ўтварае рытарычныя фігуры. *Стылістычныя, або рытарычныя, фігуры* – адзін з

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

важнейшых сродкаў паэтычнага сінаксісу, моўныя выразы, якія надаюць маўленню стылістычную значнасць, вобразнасць, мяняюць яго эмацыйную афарбоўку. Існуе мноства класіфікацый рытарычных фігур, у аснову якіх пакладзена тая ці іншая дыферэнцыяльная прыкмета: слоўны склад фразы, суадносіны яе частак і г. д. Прадставім адну з іх.

Рытарычныя фігуры падзяляюць на:

1) *семантычныя* (градацыя, рэтардацыя, ампліфікацыя, каламбур, антытэза, рытарычнае пытанне, вокліч, зваротак);

*2) сінтаксічныя:*

а) фігуры змяншэння (эліпсіс, апасіяпеза (умаўчанне, абрыў), асіндэтон);

б) фігуры дадавання (анадзіплозіс (эпанастрафа), полісіндэтон);

в) фігуры перастаноўкі (інверсія, паралелізм, ізакалон, хіязм, анафара, эпіфара (эпістрафа), сімплака, анжамбеман, анакалуф).

*Градацыя* – шэраг аднародных членаў сказа, размешчаных з нарастаннем (клімакс) або паслабленнем (антыклімакс) іх эмацыянальна-сэнсавай выразнасці. Дапамагае перадаць эмацыйную ўзрушанасць героя, нарастанне дзеяння:

Ў белай пене праносяцца коні, –
*Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць...*
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
*Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.*
(М. Багдановіч)

Gradatio ў перакладзе – змены ступені, у нечым яна падобная да ампліфікацыі (ад лац. amplification – пашырэнне), фігуры, таксама заснаванай на прынцыпе акумуляцыі.

***Ампліфікацыя*** – нагнятанне, накапленне аднатыпных слоў ці моўных канструкцый. Ампліфікацыя рэзка ўздзейнічае на ўспрыняцце твора чытачом, дазваляе павысіць тэмп твора. Як правіла, адрозненне яе ад градацыі грунтуецца на інтанацыі: градацыя расстаўляе акцэнты, ампліфікацыя мае інтанацыю пералічэння або нагрувашчвання.

А цяпер?.. Ой, штосьці кепска выходзе,
Цяпер ці не болей настала паноў,
Не надта свабодна у гэтай свабодзе.
І давай я лічыць паноў новых зноў:
*Стараста, соцкі, пісар, старшына,*
*Пасрэднік, ураднік, асэсар і суд,*
*З’езд міравы, прысутства і сход...*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Аж паднялася са страху чупрына,
Аж пальцаў не стала на весь гэты шчот.
(“Быў у чысцы” Ф. Багушэвіча)

***Рэтардацыя*** – прыём запаволення падзей праз разбіўку ці папярэджванне галоўнай часткі складаназалежнага сказа доўгай дададанай часткай. Можа быць пакладзена ў аснову кампазіцыі ўсяго верша.

Гэткім шчырым каханнем яе атуліў,
З гэткай ласкай глядзеў ў яе сумныя вочы, –
Як і сонца ня туліць расквечаных ніў,
Як і зоры людзям не ўглядаюцца ўночы!
<…>
Так услaвіў яе ў славу сонца і зор,
Так маліўся дзень-ноч к ёй мальбою нябёсаў, –
Як і мудрасць ня ўславіць ўсясвету прастор,
Як і каня ня моліцца ўлетку да росаў!
Утварыў з яе шчасце з-над шчасцяў сваё –
Чарадзейную княжну з аповесці дзіўнай,
і пад ногі ёй кінуў жыццё сваё ўсё...
……………………………………….
А яна?.. А яна была толькі... дзяўчына!..
(Янка Купала)

***Каламбур*** – гульня слоў на аснове аманіміі. Выкарыстоўваецца як для камічнага эфекту, так і для павелічэння мастацкай выразнасці. Вельмі часта – у дзіцячай літаратуры.

Скончыўся вечар цікава...
Скончыўся вечар... ці кава?
***
Марскія шпількі. Востраў казы.
Марс — кія шпіль. Кій — хвост стракaзы.
(Г. Ціханава)

***Антытэза*** – супрацьпастаўленне з’яў. Можа стаць асновай кампазіцыі цэлага твора. “Чорная гадзюка, белая змяя…” А. Сыса. У эстэтыцы рамантызму – адзін з асноўных прыёмаў.

***Рытарычныя пытанні, воклічы, звароткі*** па форме не адрозніваюцца ад звычайных граматычных зваротаў, пытальных і клічных сказаў, але надаюць маўленню большую экспрэсіўнасць. Рытарычныя пытанні – пытанні, якія не патрабуюць адказу.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Зваротак:
О Беларусь, мая шыпшына,
зялёны ліст, чырвоны цвет!
У ветры дзікім не загінеш,
чарнобылем не зарасцеш.
(У. Дубоўка)

Вокліч:
*Гэй, наперад, покі сэрца*
Б’ецца, рвецца на прастор,
Годзе млеці ў паняверцы;
*Гэй, да сонца! гэй, да зор!*
(Я. Купала)

Пытанне:
“Нашто ж на зямлі
Сваркі і звадкі, боль і горыч,
Калі ўсе мы разам ляцім
Да зор?”
(М. Багдановіч)

*Сінтаксічныя стылістычныя фігуры* ўключаюць:

*1) Фігуры змяншэння:*

***Апасіяпеза*** (умаўчанне, абрыў) – выражэнне моманту найвышэйшага напружання праз шматкроп’е, недагаворанасць, абрыў фразы. У прозе сустракаюцца пераважна ў маўленні персанажаў з мэтай падкрэсліць стан іх асаблівай узрушанасці.

А я... чакаў з усіх дарог
Цябе ў сорак чацвёртым... летам
Калоны ні адной не мог
Я прапусціць з ахапкам кветак.
(Р. Барадулін “Бацьку”)

***Асіндэтон, або бяззлучнікавасць,*** – адсутнасць злучнікаў паміж аднароднымі словамі і выразамі. Служыць перадачы сціслаcці, хуткасці змены падзей ці лаканічнасці пры вялікай сэнсавай напоўненасці.

Мужчына. Жанчына. Чаканне.
Шуканне. Блуканне. Час.
Жанчына. Мужчына. Спатканне.
Вітанне. Пытанне. Адказ.
Мужчына. Жанчына. Дыханне.
Сэрцабіццё. Забыццё.

РЕПОЗИТОРИЙ ГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Жанчына. Мужчына. Каханне.
Мужчына. Жанчына. Жыццё.
(А. Вярцінскі)

***Эліпсіс*** (эліпс) – пропуск у фразе нейкага слова, якое лёгка ўзнаўляецца з кантэксту. Дапамагае перадаць узрушаны стан героя, дынамізм, напружанасць. Часам проста дадае жыццёвасці, верагоднасці сказанаму, асабліва ў дыялогах (у паўсядзённым маўленні мы часта не ўзнаўляем усе члены сказа).

Мы не з гіпсу, мы – з камення,
Мы – з жалеза, мы – са сталі,
Нас кавалі у пламенні,
Каб мацнейшымі мы сталі.
(Цётка)

*2) Фігуры дадавання:*

***Анадзіплозіс (эпанастрафа, стык, падхват)*** – паўтор апошняга слова (выразу) вершаванага радка ці страфы ў пачатку наступнага радка. Гэта так званы “кантактны” паўтор, які дазваляе стварыць своеасабліве “кароткае замыканне” акцэнтаваць увагу на пэўным слове ці выразе ці мае функцыю рэтардацыі.

У лістападзе здымалі
Кінакліп пра Купалле.
Я здымалася ў кліпе
І праз вогнішча скокала.
Я праз вогнішча скокала
Ды згубіла спадніцу.
Я згубіла спадніцу
І ў вогнішча кінула.
І яны гэта выразалі.
А я б пакінула.
(“Klipmakimg” Джэці)

***Полісіндэтон, або шматзлучнікавасць*** – шматразовае выкарыстанне аднолькавых злучнікаў паміж аднароднымі словамі ці выразамі. Як правіла, моцны сродак узмацнення думкі, часта надае выказванню ўзнёсласць, велічнасць.

Цябе, як пушчу, адкрываю
У зменах часу і святла.
То ты прамая, то крывая,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

То немая, то гаваркая,
То ты – расінка, то – смала.
Калі ты блізка – так малюю,
Адыдзеш – і пазнаю
Бездапаможную, малую
Цябе, былінку палявую,
Былінку горную маю.
(А. Пысін)

*3) Фігуры перастаноўкі:*

***Паралелізм*** – сінтаксічная суаднесенасць аднатыпных адрэзкаў тэксту (радкоў, сказаў, строф і г. д.). Іншымі словамі – аднолькавая сінтаксічная будова суседніх радкоў або сказаў. Бывае няпоўны і поўны (***ізакалон***): “Зелянелі лугі, // Зацвіталі сады, – // З маладою сваёй // Я спаткаўся тады” (Я. Купала).

Адваротны паралелізм, пабудаваны па люстраным прынцыпе, называюць ***хіязмам***: “Нас маладосць адорвае каханнем, // Каханне нас вяртае ў маладосць” (Р. Баравікова).

***Інверсія*** – адваротны парадак слоў у сказе. Гэта дазваляе інтанацыйна падкрэсліць слова, надаць выразу прыўзнятасць, урачыстасць. Часта ўжываецца ў фальклорных стылізацыях. Інверсія можа быць *кантактнай* (калі перастаўленыя словы знаходзяцца побач) і *дыстантнай* (калі паміж імі ёсць іншыя словы).

*Стаялі мы.* Нявіданыя дзівы
Нас абымалі *крыллямі сваймі*,
Шапталі мне: вазьмі яе, шчаслівы!
Шапталі ёй: сабе яго вазьмі!
(“Яна і я” Я. Купалы)

***Анжамбеман, або перанос*** – разбіўка сінтаксічна цэласнай фразы на два радкі, заснаваная на несупадзенні міжрадковай рытмічнай і сэнсавай паўзы. Новая паўза дазваляе выразна падкрэсліць апошнюю частку перанесенай фразы. Можа быць радковым, строфным і складовым.

Мы сядзім і чакаем, што ж будзе далей,
не хаваючы закаханыя твары.
Я хачу да цябе дакрануцца, але
мы жывем у розных акварыумах.
(“Я хачу паварушыць тваім хвастом…” В. Жыбуля)

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

***Анафара*** – адзінапачатак, паўтор аднолькавых слоў ці выразаў у пачатку радкоў. Можа быць гукавой (*фанемы*), лексічнай (*словы*) і сінтаксічнай (*выразы*).

Ранкам, калі адзвіняць будзільнікі,
Заводзім наручныя гадзіннікі.
Заводзім маторы, размовы заводзім,
Заводзім канвеер на заводзе.
Разам з спружынамі і пасамі
Заводзім сябе, заводзімся самі.
(“Заводзім” А. Вярцінскага)

***Эпіфара (эпістрафа)*** – паўтор аднолькавых слоў ці выразаў у канцы радкоў.

На дрогкіх выбоінах
Шляху зямнога
Згубілася многа,
Забылася многа.
(Г. Бураўкін).

***Сімплака (спляценне)*** – адначасовае ўжыванне анафары і эпіфары або паўтор слоў у сярэдзіне радкоў.

З народнага:
***І*** туды ***гара,***
***І*** сюды ***гара,***
А паміж тымі крутымі гарамі
Ўсхадзіла зара.

***Анакалуф*** – лагічная ці сінтаксічная няўзгодненасць асобных частак выказвання, сказ з наўмыснымі стылёвымі ці граматычнымі памылкамі. Часцей за ўсё выкарыстоўваецца не ў вершах, а ў эпасе ці драме, бо дазваляе стварыць выразную характарыстыку персанажа праз яго маўленне (як камічную, так і драматычную – перадае стан крайняй усхваляванасці).

Што ні кажыце, ды ўсё ж
дзіўнае ў нас жыццё, дзіўнае
да рогату. Дзіўнае тым [падкрэслена аўтарам. – А. Б.].
(В. Татур)

Як і тропы, фігуры паэтычнага сінтаксісу ў мастацкім тэксце могуць злучацца, напластоўвацца адна на адну.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# 4 ПРЫКЛАДНЫЯ ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНУ

## ПЫТАННІ*
## да экзамену па курсе “Уводзіны ў літаратуразнаўства” для студэнтаў I курса спецыяльнасці I – 21 05 02 “Беларуская філалогія” філалагічнага і завочнага факультэтаў

1 Літаратуразнаўства як сістэма ведаў пра літаратуру.

2 Самастойныя і дапаможныя дысцыпліны літаратуразнаўства і іх узаемасувязь.

3 Гісторыя развіцця літаратуразнаўства як навукі.

4 Напрамкі літаратуразнаўства на сучасным этапе.

5 Спецыфіка літаратуры як вобразна-слоўнага мастацтва і яе ўзаемасувязь з іншымі відамі мастацтва.

6 Паняцце эстэтычнага ідэалу і гуманістычная скіраванасць прыгожага пісьменства.

7 Асаблівасці падзелу мастацкіх твораў на роды і жанры: гісторыя пытання.

8 Агульная характарыстыка эпасу як самастойнага роду літаратуры.

9 Малыя празаічныя адзінкі і іх асаблівасці.

10 Сярэднія і буйныя формы эпасу: спецыфіка арганізацыі мастацкага матэрыялу і ўвасаблення задумы.

11 Спецыфіка арганізацыі драмы як роду літаратуры; паняцце канфлікту і яго роля ў драматургічным творы.

12 Багацце драматургічных жанраў, іх дыфузія і міжжанравыя ўтварэнні.

13 Лірыка як адзін з асноўных родаў літаратуры.

14 Класіфікацыя лірыкі.

15 Разнастайнасць лірычных відаў.

16 Лірычныя жанры і іх характарыстыка.

17 Спецыфіка ліра-эпасу як роду літаратуры.

18 Версіфікацыя як сістэма гукавой арганізацыі паэтычнай мовы, страфіка.

19 Паняцце рыфмы і яе класіфікацыі.

20 Антычнае (метрычнае) і сілабічнае вершаскладанне і іх асаблівасці.

21 Сілаба-танічны верш.

22 Танічная сістэма вершаскладання і яе народна-песенныя вытокі; верлібр.

23 Прынцыпы аналізу і шляхі разгляду літаратурнага твора; адзінства зместу і формы як асноўны закон мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

24 Тэма, праблема, ідэя як асноўныя складнікі зместу твора.

25 Пафас і канфлікт як асноўныя складнікі зместу твора.

26 Сюжэт як зместава-фармальны кампанент твора.

27 Персанаж, тып, характар як самастойныя адзінкі мастацкай арганізацыі тэксту.

28 Кампазіцыя твора і яе асноўныя разнавіднасці.

29 Мова як першаэлемент літаратуры, мова вершаваная і празаічная.

30 Лексіка абмежаванага выкарыстання і агульнанародная лексіка (сінонімы, антонімы, амонімы і іх віды) ў мастацкай літаратуры.

31 Народная фразеалогія і спецыфічная лексіка ў складзе мовы мастацкіх тэкстаў.

32 Паняцце тропаў, іх функцыі і тыпалогія.

33 Метафарычныя тропы (метафара, увасабленне, персаніфікацыя, празапапея, катахрэза, аксюмаран).

34 Метафарычныя тропы (сімвал, алегорыя, паралелізм, параўнанне, эпітэт).

35 Метанімічныя тропы (метанімія, сінекдаха, антанамазія, перыфраза, эўфемізм, дысфемізм).

36 Іншыя віды тропаў (іронія, сарказм, гратэск, інвектыва, гіпербала, літота, алюзія, рэмінісцэнцыя, апастрофа, сінестазія).

37 Паэтычная фанетыка і яе элементы.

38 Інтанацыя; семантычныя рытарычныя фігуры ў мастацкім тэксце.

39 Сінтаксічныя стылістычныя фігуры.

40 Антычнае мастацтва і яго характарыстыка.

41 Сярэднявечча і яго асноўныя адзнакі.

42 Культура эпохі Адраджэння.

43 Класіцызм як літаратурны напрамак.

44 Рамантызм і яго адметнасці.

45 Адметнасці эстэтыкі і філасофіі сентыменталізму.

46 Рэалізм як літаратурны напрамак, яго разнавіднасці.

47 Літаратурны напрамак, плынь як разнавіднасць літаратурнага напрамку; літаратурная групоўка і школа.

48 Разнастайнасць літаратурных плыней канца XIX–XX стагоддзяў (сімвалізм, акмеізм, імажынізм, імпрэсіянізм, футурызм).

49 Асноўныя літаратурныя плыні XX стагоддзя (экспрэсіянізм, сюррэалізм, экзістэнцыялізм); мастацтва постмадэрнізму.

50 Творчая індывідуальнасць мастака слова.

**Трэцяе пытанне ў кожным білеце мае практычны характар і прадугледжвае аналіз вершаванага ўрыўка.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Вытворча-практычнае выданне

**Брадзіхіна** Ала Васільеўна

# Уводзіны ў літаратуразнаўства

Практычны дапаможнік

Рэдактар *В. І. Шкрэдава*
Карэктар *В. У. Калугіна*

Падпісана да друку 05.05.2021. Фармат 60x84 1/16.
Папера афсетная. Рызаграфія.
Ум. др. арк. 3,02. Ул.-выд. арк. 3,3.
Тыраж 20 экз. Заказ 251.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны”
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вырабніка,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 3/1452 ад 17.04.2017.
Спецыяльны дазвол (ліцэнзія) № 02330 / 450 ад 18.12.2013.
Вул. Савецкая, 104, 246028, Гомель

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ